УДК 373.3.016:82

# БУКТРЭЙЛЕР ЯК СРОДАК РАЗВІЦЦЯ ТВОРЧАГА ПАТЭНЦЫЯЛУ БУДУЧЫХ НАСТАЎНІКАЎ ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАЎ У ВУЧЭБНАЙ І ДАСЛЕДЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

**Д. А. Доўгаль, А. А. Свірыдзенка**
(Установа адукацыі "Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова", кафедра тэорыі і методыкі пачатковай адукацыі)

*У артыкуле раскрываюцца магчымасці выкарыстання такога сродку візуалізацыі, як буктрэйлер, у вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў спецыяльнасці "Пачатковая адукацыя" з мэтай развіцця іх творчага патэнцыялу.*

Праграма бесперапыннага выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі на 2021–2025 гг. [3] ставіць за мэту стварэнне ўмоў для фарміравання markrознабакова развітой, маральна і сацыяльна сталай творчай асобы навучэнца. Гэта сведчыць пра неабходнасць укаранення ў адукацыйны працэс устаноў вышэйшай адукацыі метадаў, прыёмаў, сродкаў навучання, якія дапамогуць студэнтам не толькі авалодаць пэўнымі метадычнымі ведамі, уменнямі і навыкамі, але і развіць іх творчы патэнцыял.

У навуковай літаратуры адсутнічае агульнапрынятае вызначэнне творчага патэнцыялу асобы. Л.А. Дарынская акрэсліваеяго як "складанае інтэгральнае паняцце, якое ўключае кампаненты, што ў сукупнасці прадстаўляюць веды, уменні, здольнасці і памкненні асобы да пераўтварэнняў у розных сферах дзейнасці" [2, с. 13]. Развіццё творчага патэнцыялу навучэнцаў у адукацыйным асяроддзі ажыццяўляецца ў сумеснай, асобасна значымай дзейнасці суб'ектаў адукацыі, арыентаванай на развіццё здольнасцей, ведаў, уменняў, адносін.

Асноўнай дзейнасцю ва ўстанове адукацыі з'яўляецца адукацыйная. Яна ажыццяўляецца галоўным чынам праз сістэму вучэбных дысцыплін. Дысцыпліны модуля "Методыка філалагічнай адукацыі малодшых школьнікаў" скіраваны на фарміраванне ў студэнтаў спецыяльнасці "Пачатковая адукацыя" шэрагу кампетэнцый, сярод якіх – ажыццяўленне прафесійнай дзейнасці ва ўмовах абнаўлення яе мэт, зместу, змены тэхналогій. Адной з істотных рыс сучаснай педагагічнай практыкі з'яўляецца шырокае выкарыстанне візуалізацыі–прадстаўлення даных у выглядзе зрокавых выяў.

Эфектыўным сродкам візуалізацыі на ўроках чытання з'яўляецца буктрэйлер – міні-ролік, які прэзентуе пэўную кнігу ці літаратурны твор. У буктрэйлеры знаёмства з кнігай ажыццяўляецца праз экранізацыю, якая ствараецца пры дапамозе разнастайных камп'ютарных праграм, што аб'ядноўваюць літаратуру з графічнымі, гукавымі і электроннымі сродкамі. Спалучэнне ў буктрэйлеры літаратурнай асновы з візуалізацыяй інфармацыі спрыяе павышэнню цікавасці школьнікаў да чытання, удасканаленню чытацкіх уменняў і камунікацыйных навыкаў [1].

Знаёмства студэнтаў з буктрэйлерам натуральна ажыццяўляецца ў межах вучэбных дысцыплін "Методыка выкладання літаратурнага чытання" і"Методыка развіцця маўлення". На занятках, прысвечаных пытанню фарміравання чытацкай самастойнасці, буктрэйлер прэзентуецца ў шэрагу сродкаў павышэння чытацкай актыўнасці і пазнавальнага інтарэсунавучэнцаў. Знаёмства ўключае некалькі этапаў: вывучэнне тээрэтычнай інфармацыі пра сродкі візуалізацыі; прагляд асобных буктрэйлераў (на кафедры тэорыі і методыкі пачатковай адукацыі МДУ імя А.А. Куляшова створана відэатэка ролікаў па творах беларускай, рускай і сусветнай дзіцячай літаратуры); аналіз зместавых і фармальных кампанентаў роліка, у прыватнасці, вызначэнне яго разнавіднасці паводле візуальнага ўвасаблення – гульнявы, негульнявы або анімацыйны; распрацоўка метадычных аспектаў выкарыстання буктрэйлераў. Студэнты вызначаюць этапы стварэння буктрэйлера:

выбар твора / кнігі,

распрацоўка сцэнарыя і раскадроўка візуалізацыі (прадумванне паслядоўнасці слайдаў, іх структуры і зместавага напаўнення),

вызначэнне і падбор матэрыялу для стварэння роліка,

вызначэнне праграм для запісу тэксту і працы з відэа (Audacity, FreeAudioRecorder; SonyVegasPro, YouCutVideoEditor (мабільны дадатак), MovaviVideoEditor і інш.).

Маючы ўяўленне пра дадзены сродак візуалізацыі, студэнты атрымліваюць заданне распрацаваць буктрэйлер у межах традыцыйнай летняй акцыі *#чытайлета* (праводзіцца ў перыяд летніх канікул). Гэта заданне, не прадугледжанае вучэбнымі праграмамі ўказаных вышэй дысцыплін, не з'яўляецца абавязковым, таму дазваляе праявіць сябе студэнтам з высокім узроўнем матывацыі (матывацыйны кампанент – неабходны складнік творчага патэнцыялу). Падрыхтаваныя ролікі прэзентуюцца і абмяркоўваюцца на вучэбных занятках, дэманструюцца ў факультэцкай суполцы сацыяльнай сеткі "Вконтакте", становяцца



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

формай рэфлексіі летняй працы і адпачынку, нагодай для развіцця звязнага маўлення.

Выявіўшы такім чынам высокаматываваных студэнтаў з належным узроўнем развіцця спецыяльных метадычных і тэхнічных ведаў і ўменняў, выкладчыкі могуць уключаць іх у даследчую дзейнасць. Яны становяцца членамі навуковых студэнцкіх таварыстваў, рэалізуюць свой патэнцыял у навуковых мерапрыемствах, удзельнічаюць у студэнцкіх конкурсах прафесійнага майстэрства. Пры гэтым атрыманы вопыт стварэння буктрэйлераў нярэдкастановіцца асновай наступных распрацовак.

Яркім прыкладам такога шляху – праз буктрэйлер з вучэбнай у праектную і даследчую дзейнасць – з’яўляецца індывідуальная адукацыйная траекторыя выпускніцы спецыяльнасці “Пачатковая адукацыя” Ксеніі Басюк. У межах акцыі *#чытайлета* яна стварыла анімацыйны буктрэйлер да твора А.М. Грабоўскага “Галляш Бяляшык – сябра цмокаў”. Гэта распрацоўка затым была выкарыстана ў прэзентацыі праекта “Дзіцячая літаратура Магілёўшчыны: творцы і кнігі” на ўніверсітэцкім этапе маладзёжнага інавацыйнага конкурсу “100 ідэй для Беларусі”, прызёрам якога стала студэнтка. Пасля гэтага ў складзе часовага навуковага калектыву “Лінгвадыдактычнай майстэрні” К. Басюк пад кіраўніцтвам дацэнта кафедры тэорыі і методыкі пачатковай адукацыі А.А. Свірыдзенка актыўна займалася распрацоўкай разнастайных аўтарскіх сродкаў візуалізацыі літаратурнага матэрыялу, рыхтавала публікацыі, удзельнічала ў конкурсах. Яна стала пераможцам Міжнароднага конкурсу студэнцкіх творчых работ “Мая любімая кніга”, які праходзіў у Тульскім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Л.М. Талстога. Канспект распрацаванага ёй урока з буктрэйлерам да казкі В. Катаева “Цветик-семицветик” быў адзначаны дыпломам І ступені. Лагічным працягам стала падрыхтоўка і паспяховая абарона студэнткай дыпломнага даследавання, апрабацыя і ўкараненне атрыманых вынікаў (у тым ліку аўтарскага вучэбна-метадычнага камплекта дыдактычных матэрыялаў для малодшых школьнікаў “Нескучное чтение”) у навучальны працэс універсітэта і ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Удзел у рэспубліканскім конкурсе навуковых работ студэнтаў і перамога ў ім (1 катэгорыя) – гэта фінальны акорд карпатлівай навукова-метадычнай працы студэнта і педагога.

Правільна падабраныя метады, формы і сродкі навучання, да якіх, безумоўна, адносіцца буктрэйлер,робяць навучанне цікавым, разнастайным і эфектыўным, спрыяюць развіццю творчага патэнцыялу будучых настаўнікаў пачатковых класаў.

**Літаратура**

1. Басюк, К. С. Буктрейлер как способ визуальной коммуникации на I ступени общего среднего образования / К. С. Басюк, Е. А. Свириденко // Детский сад – начальная школа: опыт, преемственность, перспективы : сб. науч. тр. / УО МГПУ им. И. П. Шамякина ; редкол.: Б. А. Крук (отв. ред) [и др.]. – Мозырь : МГПУ им. И. П. Шамякина, 2022. – С. 20–22.

2. Доринская, Л. А. Гуманитарные основания развития творческого потенциала учащихся: автореферат диссертации на соискание ученой степени доктора педагогических наук: 13.00.01 / Л. А. Доринская. – Санкт-Петербург, 2006. – 44 с.

3. Программа непрерывного воспитания детей и учащейся молодежи на 2021–2025 гг. // [Электронный ресурс] : программа. – Режим доступа : https://adu.by/images/2021/03/programma-vospitaniya-2021-2025.pdf. – Дата доступа : 31.01.2024.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова